УДК 94 (476:4-470)«1921/1922»

***Вольга Мікалаеўна Бароўская***
*канд. гіст. навук, ст. навук. супрацоўнік Цэнтра ўсеагульнай гісторыі,*
*міжнародных адносін і геапалітыкі Інстытута гісторыі*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
***Olga Borovskaya***
*PhD in History, Senior Research Fellow of the Center for World History,*
*International Relations and Geopolitics of the Institute of History*
*of National Academy of Sciences of Belarus*
e-mail: borovskaya-olga@mail.ru

# ГАНДЛЁВАЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА БССР У ПОЛЬШЧЫ Ў 1921–1922 гг.

*Разгледжана пытанне існавання самастойнага гандлёвага прадстаўніцтва БССР у Польшчы ў 1921–1922 гг. Звернута ўвага, што дзякуючы намаганням беларускага прадстаўніцтва быў заключаны шэраг камерцыйных дагавораў з польскімі акцыянернымі таварыствамі на экспарт мясцовай сыравіны і імпарт прамысловых тавараў. У жніўні 1922 г. на Калегіі Народнага камісарыята знешняга гандлю РСФСР было прынята рашэнне аб ліквідацыі асобнага Гандлёвага прадстаўніцтва БССР у Польшчы па прычыне эканамічнай немэтазгоднасці яго існавання. Ажыццяўленне ўсіх беларускіх экспартна-імпартных аперацый перайшло да Гандлёвага прадстаўніцтва РСФСР у Польшчы.*

***Ключавыя словы:*** *гандлёвае прадстаўніцтва, экспартна-імпартныя аперацыі, знешні гандаль, пошліна.*

## *The Trade Mission of the BSSR in Poland in 1921–1922*

*The article examines the issue of the existence of an independent trade representative office of the BSSR in Poland 1921–1922. It should be noted that thanks to the efforts of the Belarusian delegation, a number of commercial contracts were concluded with Polish joint-stock companies for the supply of local raw materials (export) and industrial goods (import). In August 1922, the Collegium of the People's Commissariat of Foreign Trade of the RSFSR made a decision to liquidate a separate trade representative office of the BSSR in Poland due to the economic impracticality of its existence. The implementation of all Belarusian export-import operations was transferred to the Trade Representative Office of the RSFSR in Poland.*

***Key words:*** *trade mission, export-import operations, international trade, duty.*

## Уводзіны

Рыжскі мірны дагавор быў сродкам пацыфікацыі ўсходнееўрапейскага рэгіёну, фінальнай кропкай ваенных дзеянняў, якія спусташалі беларускія землі на працягу амаль васьмі гадоў. Дагавор залажыў асновы мірнага будаўніцтва і развіцця тэрыторыі Беларусі. Згодна з гэтым дыпламатычным дакументам адбылося афіцыйнае прызнанне ў якасці самастойных суб'ектаў міжнароднага права БССР і УССР, намеціліся шляхі вырашэння многіх спрэчных пытанняў, у тым ліку заключэнне гандлёвых дагавораў, а таксама шляхі пабудовы эфектыўнага эканамічнага супрацоўніцтва.

У гістарыяграфіі пытанне ўзаемаадносін БССР і Польшчы не станавілася самастойным аб'ектам даследаванняў. Першапачатковае асмысленне гэтай тэмы адбываецца ў публіцыстычных артыкулах І. Адамайціса [1], І. Тэўміна [2] і на старонках штогадовых аглядаў дзейнасці Упраўлення ўпаўнаважанага Народнага камісара знешняга гандлю (НКЗГ) РСФСР пры СНК БССР [3].

У савецкай гістарыяграфіі варта вылучыць дысертацыю П. К. Краўчанкі [4], які, аднак, абыходзіць сваёй увагай спрэчныя пытанні ва ўзаемаадносінах паміж Упраўленнем упаўнаважанага НКЗГ РСФСР пры СНК БССР і НКЗГ РСФСР.

У сучаснай расійскай і беларускай гістарыяграфіі можна адзначыць даследаванні А. В. Барыкіна [5] і Д. У. Раманоўскага [6]. Але адсутнасць прац, прысвечаных непасрэдна вывучэнню знешнеэканамічных адносін БССР і Польшчы міжваеннага перыяду, пры наяўнасці дастатковай крыніцавай базы павышае актуальнасць пастаўленай праблемы.

Мэта артыкула – вызначыць ролю і месца гандлёвага прадстаўніцтва БССР у Польшчы ў 1921–1922 г. у сістэме беларуска-польскіх стасункаў. Для дасягнення пастаў-

ленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

1) вызначыць храналагічныя рамкі існавання гандлёвага прадстаўніцтва БССР у Польшчы;

2) раскрыць прычыны спынення працы самастойнага прадстаўніцтва НКЗГ БССР у Польшчы;

3) ахарактарызаваць дзейнасць гандлёвага прадстаўніка БССР у Польшчы ў 1921–1922 гг.

**Асноўная частка**

Для кіраўніцтва нацыяналізаваным знешнім гандлем і тавараабменам РСФСР згодна з дэкрэтам СНК РСФСР ад 11 чэрвеня 1920 г. быў створаны Народны камісарыят знешняга гандлю (НКЗГ) РСФСР. Пытаннямі знешняга гандлю ў межах Беларусі займалася Упраўленне ўпаўнаважанага НКЗГ РСФСР пры СНК БССР (Белзнешгандаль), якое пачало функцыянаваць з 16 чэрвеня 1921 г. [7, арк. 60].

Упраўленне ўпаўнаважанага Народнага камісарыята знешняга гандлю РСФСР пры СНК БССР складалася з непасрэдна ўпаўнаважанага (з чэрвеня 1921 па жнівень 1922 г. – Ісаак Уладзіміравіч Тэўмін, са жніўня 1922 па лістапад 1924 г. – Іосіф Уладзіміравіч Ленскі), яго намесніка (Аляксандр Фёдаравіч Ульянаў), кансультанта-эканаміста (Адольф Аўгуставіч Цыварт), а таксама сакратара, справаводца і кур'ера. З мэтай усталявання знешнеэканамічных сувязей у жніўні 1921 г. Белзнешгандаль накіраваў свайго прадстаўніка ў склад Паўнамоцнага прадстаўніцтва РСФСР у Варшаве. Са жніўня 1921 г. па жнівень 1922 г. ім з'яўляўся Максім Давыдавіч Штэрн.

6 верасня 1921 г. паміж Белзнешгандлем у асобе І. У. Тэўміна і Саюзам Беластоцкай буйной прамысловасці (З. З. Суравіч і А. А. Фінкель) быў заключаны дагавор на пастаўку суконнага тавару [8, арк. 15]. Акрамя таго, 23 верасня 1921 г. быў падпісаны дагавор з польска-амерыканскім гандлёвым таварыствам «Паланцін» (яго прадстаўляў Л. Дзенцыюльскі) на ажыццяўленне пісьмовых заказаў Белзнешгандлю. Прадугледжвалася, што аплата тавараў будзе праводзіцца толькі па арыгінальных рахунках з налічэннем расходаў па транспарціроўцы, страхоўцы, выплаце пошліны, адпраўцы і ахове грузаў у шляху, што не перавышала 40 % ад сумы рахунку [8, арк. 30]. Праз некалькі тыдняў, 6–7 кастрычніка 1921 г., адбыўся шэраг сустрэч М. Д. Штэрна з прадстаўнікамі «Паланціна» аб прадстаўленні яму выключных правоў на ўвоз у БССР замежных тавараў на суму да 1 млн залатых руб. і вываз на такую ж суму сыравіны. У сваю чаргу, Белзнешгандаль атрымоўваў 35 % з вывазу і ўвозу натурай або грашыма, акрамя пошліны, якая сплочвалася на агульнай аснове [9, арк. 31].

Польска-амерыканскае таварыства «Паланцін» займалася закупкай экспартнай сыравіны, у тым ліку пушніны (скуры ваўкоў, лісіц, белак, барсукоў, суркоў, мядзведзяў, рысяў, сабак, зайцаў-русакоў, зайцаў-белякоў), авечай шэрсці, дубільнага экстракта, соды, казаноў, перцу, конскіх валасоў, запалкавай саломкі, ільняной макухі, жалезнага лома. У БССР увозіліся селядзец, каніфоль, галантэрэйныя тавары (грэбні, гузікі, ленты для падцяжак, гума для падвязак, іголкі, кнопкі, зубныя шчоткі, булаўкі, спіцы, кручкі) і інш.

21 верасня 1921 г. акцыянернае таварыства «Брытаполь» падпісала дагавор з Белзнешгандлем, паводле якога беларускі бок перадаваў «Брытаполі» права экспарту на камісійных пачатках і продажу ў Польшчы і за яе межы сыравіны і іншых тавараў на наступных умовах:

1) дастаўка сыравіны і тавараў да польскай мяжы браў на сябе НКЗГ, а транспарціроўку па польскай тэрыторыі ажыццяўляў непасрэдна «Брытаполь»;

2) любы продаж ажыццяўляўся «Брытаполем» толькі пасля пісьмовага зацвярджэння яго прадстаўніком НКЗГ БССР у Польшчы, а пры яго адсутнасці – прадстаўніком НКЗГ РСФСР;

3) сумы, якія атрымоўваў «Брытаполь» ад продажу сыравіны і тавараў, запісваліся на спецыяльны рахунак і цалкам знаходзіліся ў яго распараджэнні;

4) камісійнае ўзнагароджанне БССР выплочвалася наступным чынам: за першыя атрыманыя 200 млн польскіх марак – 15 % ад сумы, калі ж сума перавышала 200 млн польскіх марак, то 10 %;

5) усе расходы па перавозцы экспартных тавараў і сыравіны ад польскай мяжы, аплаце пошлін, страхоўцы і захаванні аплочваліся НКЗГ па прадстаўленні арыгінальных рахункаў [8, арк. 45].

Акцыянернае таварыства «Брытаполь» актыўна супрацоўнічала з «Заходнялесам» па пастаўках лесаматэрыялаў. У снежні 1921 г. гандлёвы прадстаўнік БССР у Польшчы М. Д. Штэрн паведамляў, што «справа гандлю з Беларуссю знаходзіцца на стадыі, калі неабходна… пасрэдніцтва “Брытаполя”» [10, арк. 1–2]. Такім чынам, манапольнае права «Брытаполя» на экспарт лесаматэрыялаў з беларускіх зямель перашкаджала беларускаму боку павышаць цэны і мяняць контрагента.

У студзені 1922 г. на Калегіі НКЗГ РСФСР было разгледжана пытанне аб мэтазгоднасці самастойнага гандлёвага прадстаўніцтва БССР пры Паўнамоцным прадстаўніцтве РСФСР у Польшчы. З перапіскі НКЗГ РСФСР з М. Д. Штэрнам (2–3 студзеня 1922 г.) становіцца зразумелым, што «асобнае польскае прадстаўніцтва БССР» з’яўляецца «празмернай справай», «варшаўскі гандлёвы прадстаўнік (С. Р. Гарчакоў. – *В. Б.*) не мае дастаткова працы для Цэнтра».

НКЗГ РСФСР прыняў рашэнне аб уключэнні беларускага прадстаўніка ў «апарат Гандлёвага прадстаўніцтва для спецыяльнай… працы. Праца вядзецца ад імя Гандлёвага прадстаўніцтва». М. Д. Штэрну раілі знайсці кампраміс у зносінах з гандлёвым прадстаўніком РСФСР у Польшчы С. Г. Гарчаковым, «каб… даручэнні маглі быць выкананы з максімальнай хуткасцю» [10, арк. 15].

3 студзеня 1922 г. І. У. Ленскі, упаўнаважаны Упраўлення НКЗГ РСФСР пры СНК БССР, у сваім лісце да М. Д. Штэрна выказваў такую надзею: «Мы зможам дамовіцца. Становішча ў нас яшчэ не канчаткова высветлілася, чакаем у канцы гэтага тыдня двух членаў Калегіі з Масквы, якія, па ўсёй верагоднасці, установяць канчаткова памеры і формы нашай далейшай працы. Планы маюцца пакуль дастаткова шырокія. У любым выпадку нам прыйдзецца значна перабудаваць сваю працу. У Польшчы прыйдзецца закупаць выключна толькі прадукты польскага паходжання. Спіс іх… дастаткова абмежаваны. Астатнія тавары будзем закупаць у Германіі, Аўстрыі, Чэхаславакіі (краіны «з нізкай валютай» – *В. Б.*). Роля фірмаў, з якімі мы да гэтага часу працавалі, значна зменшыцца да нашай выгады, бо калі мы першапачаткова былі вымушаны… на іх абапірацца, то зараз мы ўжо можам стаць на свае ногі, асабліва ў сувязі з… экспартам» [11, арк. 1].

Перапіска І. У. Ленскага і М. Д. Штэрна (сакавік 1922 г.) сведчыць аб тым, што паміж беларускім гандлёвым прадстаўніком у Польшчы і С. Р. Гарчаковым часта ўзнікалі канфліктныя сітуацыі па пытаннях паставак у Польшчу лесаматэрыялаў. Згодна з дагаворам ад 21 верасня 1921 г. таварыства «Брытаполь» атрымала манапольнае права на пастаўку лесу з Беларусі. Аднак у студзені 1922 г. схема паставак была зменена: нарыхтоўка і правядзенне экспартных аперацый пераходзілі да «Заходнялесу» – дзяржаўнага аб’яднання экспартнай лясной прамысловасці, створанага 2 снежня 1921 г. У пачатку сакавіка 1922 г. М. Д. Штэрн адзначаў: «Умовы экспарту, якія ў свой час былі заключаны намі з “Брытаполем”, а пасля з “Паланцінам”, у цяперашні час для “Заходнялеса” непрымальныя… Пакуль лясны экспарт будзе працягвацца, але ўмовы ўзнагароджання “Брытаполя” і “Паланціна” будуць іншыя» [11, арк. 1].

15 сакавіка 1922 г. упаўнаважаны Белзнешгандлю І. У. Ленскі прасіў С. Р. Гарчакова выказаць меркаванне «аб працы нашага прадстаўніка М. Д. Штэрна, ці дзейнічае ён з вамі ў поўным кантакце і… ці ўстанавіліся на практыцы нармальныя ўзаемаадносіны паміж вамі. Аб любых заўважаных дэфектах і ненармальнасцях просім тэрмінова нас інфармаваць» [11, арк. 33].

Канчаткова справа ліквідацыі самастойнага гандлёвага прадстаўніцтва БССР у Польшчы вырашалася ў жніўні 1922 г. у НКЗГ РСФСР. 30 жніўня 1922 г. у Маскву былі запрошаны старшыня СНК БССР А. Р. Чарвякоў і ўпаўнаважаны НКЗГ РСФСР пры СНК БССР І. У. Ленскі «для тлумачэння сітуацыі і для дакладнага афармлення становішча Знешгандлю Беларусі» [12, арк. 37].

Нарэшце пастанавілі, што экспартна-імпартныя аперацыі НКЗГ БССР будзе ажыццяўляць Гандлёвае прадстаўніцтва РСФСР у Польшчы. Ліквідацыя пасады гандлёвага прадстаўніка НКЗГ БССР у Польшчы і адстаўкі М. Д. Штэрна ў Варшаву ў якасці спецыяліста па экспарту быў накіраваны намеснік упаўнаважанага Белзнешгандлю А. А. Цыбарт [12, арк. 209]. 16 студзеня 1923 г. яго замяніў А. Д. Гальперын, якому даручалася «праз пасрэдніцтва Ганд-

лёвага прадстаўніцтва РСФСР весці перамовы як з дзяржаўнымі ўстановамі, так і з прыватнымі асобамі і прадпрыемствамі па гандлёвых аперацыях, прадаваць і купляць пры пасрэдніцтве апарата Гандлёвага прадстаўніцтва ўсялякія тавары, як экспартныя, так і імпартныя, за наяўныя і ў крэдыт, атрымоўваць для названага Упраўлення ад усіх асоб і ўстаноў… рухомую маёмасць, тавары, грошы і рознага віду абавязкі, заключаць ад імя названага Упраўлення і ў згодзе з Гандлёвым прадстаўніцтвам… дагаворы аб пакупцы і продажы тавараў і аб пастаўцы іх на ўмовах па сваім меркаванні, атрымоўваць плацяжы і грашовыя сумы, якія належаць упраўленню… па пераводах, трансферах, тэлеграмах, талонах… ажыццяўляць плацяжы і інш.» [12, арк. 3–3ад.].

З перапіскі Белзнешгандлю з Гандлёвым прадстаўніцтвам РСФСР у Польшчы (сярэдзіна верасня 1922 г.) вынікае, што Гандлёвае прадстаўніцтва ёсць толькі паўнамоцны орган НКЗГ РСФСР, які выконвае заданні НКЗГ і яго падраздзяленняў. Але пры гэтым яно хацела атрымліваць 50 % з агульнай сумы камісійнага збору ад узнагароджання, якое належала беларускаму боку. Белзнешгандаль канстатаваў: «Намі выконваюцца даручэнні па ўсталяванні пэўных ліцэнзаваных збораў, і любыя адлічэнні… гэтых сум мы лічым незаконнымі». Адзначалася таксама, што любыя перамовы з прад-стаўнікамі фірм без вядомасці НКЗГ БССР ідуць насуперак існуючым дагаворам [13, арк. 425].

28 верасня 1922 г. падчас нарады ў НКЗГ РСФСР у прысутнасці намесніка народнага камісара знешняга гандлю РСФСР М. І. Фрумкіна і ўпаўнаважанага НКЗГ РСФСР у БССР І. У. Ленскага быў узгоджаны дакумент «Аб парадку спагнання камісійнага ўзнагароджання Белзнешгандлем і Гандлёвым прадстаўніцтвам». У ім адзначаецца, што «па ўсіх даручэннях Белзнешгандлю гандлёвым прадстаўнікам у Польшчы спаганяецца 5 % адлічэнняў, якія ажыццяўляюцца з асобага рахунку Белзнешгандлю ў Варшаве; па ўсіх заказах камісійнага характару на імпартныя тавары Белзнешгандлем прадстаўляецца на карысць гандлёвага прадстаўніка ў Польшчы 1/3… камісійнага ўзнагароджання. Пры ўстанаўленні Белзнешгандлем камісійнага ўзнагароджання ў таварным выглядзе Гандлёвае прадстаўніцтва РСФСР у Польшчы прадстаўляе камісійнае ўзнагароджанне ў памеры 1/3 узнагароджання Белзнешгандлю» [14, арк. 57]. Пытанне ж аб прадстаўніцтве Белзнешгандлю ў апараце прадстаўніцтва НКЗГ РСФСР у Польшчы засталося «адкрытым».

20 кастрычніка 1922 г. была заключана дамова паміж Гандлёвым прадстаўніцтвам РСФСР у Польшчы і Белзнешгандлем адносна размеркавання паміж імі ўзнагароджання па камісійных заказах. У выніку было вырашана, што ўсе камісійныя адлічэнні спаганяюцца Гандлёвым прадстаўніцтвам НКЗГ РСФСР, а працэнтнае ўзнагароджанне, якое належала беларускаму боку, налічваецца на рахункі прадстаўніцтва ці спаганяецца Упраўленнем непасрэдна з контрагентаў у Варшаве. Камісійнае ўзнагароджанне складала 30 % грашыма ці таварамі [15, арк. 37].

**Заключэнне**

Наяўнасць самастойнага гандлёвага прадстаўніка БССР пры Паўнамоцным прадстаўніцтве РСФСР і УССР у Польшчы ў 1921–1922 гг. дазволіла беларускаму боку заключыць шэраг камерцыйных дагавораў на пастаўку мясцовай сыравіны ў Польшчу і прамысловых тавараў у БССР.

Рашэнне аб ліквідацыі асобнага прадстаўніцтва НКЗГ БССР у Польшчы прымалася ў жніўні 1922 г. на Калегіі НКЗГ РСФСР і тлумачылася «эканамічнай немэтазгоднасцю».

Вырашэнне ўсіх знешнеэканамічных спраў БССР пераходзіла да Гандлёвага прадстаўніцтва РСФСР у Польшчы. Аднак пры ажыццяўленні экспартна-імпартных аперацый узнікаў шэраг спрэчных momantaў па вызначэнні камісійнага ўзнагароджання, які беларускі бок павінен быў выплачваць Гандлёваму прадстаўніцтву РСФСР у Польшчы, а таксама па допуску беларускага эксперта ў склад экспартаімпартнага савета прадстаўніцтва.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Адамайтис, И. Наш экспорт и внешний рынок (По материалам заграничной командировки) / И. Адамайтис // Савец. будаўніцтва. – 1928. – № 5. – С. 2–5.
2. Теумин, И. Объединение Западной области с точки зрения внешней торговли / И. Теумин // Нар. хоз-во Белоруссии. – 1922. – № 2–3. – С. 42–47.
3. Внешняя торговля Белоруссии в 1923–1924 хоз. году. Очерк деятельности Управления уполномоченного Наркомвнешторга при СНК БССР и Государственной экспортно-импортной конторы «Госторгбел». – Минск, 1925. – 74 с.
4. Кравченко, П. К. Экономические и культурные связи БССР с зарубежными странами (1921–1932 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук / П. К. Кравченко. – Минск, 1976. – 31 с.
5. Барынкин, А. В. Польша во внешнеполитической стратегии Советской России (1918–1919 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.15 / А. В. Барыкин. – СПб., 2013. – 54 с.
6. Романовский, Д. В. Внешнеэкономические связи БССР с зарубежными странами (на примере работы Госторгбела в 1922–1931 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Д. В. Романовский. – Минск, 2003. – 37 с.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 491. Воп. 1. Спр. 100.
8. НАРБ. – Ф. 126. Воп. 1. Спр. 123.
9. НАРБ. – Ф. 126. Воп. 1. Спр. 81.
10. НАРБ. – Ф. 126. Воп. 1. Спр. 108.
11. НАРБ. – Ф. 126. Воп. 1. Спр. 106.
12. НАРБ. – Ф. 491. Воп. 1. Спр. 166.
13. НАРБ. – Ф. 491. Воп. 1. Спр. 111.
14. НАРБ. – Ф. 491. Воп. 1. Спр. 176.
15. НАРБ. – Ф. 126. Воп. 1. Спр. 174.

REFERENCES

1. Adamajtis, I. Nash eksport i vnieshnij rynok (Po matierialam zagranichnoj komandirovki) / I. Adamajtis // Saviec. budaunictva. – 1928. – № 5. – S. 2–5.
2. Tieumin, I. Ob’jedinienije Zapadnoj oblasti s tochki zrienija vnieshniej torgovli / I. Tieumin // Nar. khoz-vo Bielorussii. – 1922. – № 2–3. – S. 42–47.
3. Vnieshniaja torgovlia Bielorussii v 1923–1924 khoz. godu. Ochierk diejatiel’nosti Upravlienija upolnomochiennogo Narkomvnieshtorga pri SNK BSSR i Gosudarstviennoj eksportno-importnoj kontory «Gostorgbiel». – Minsk, 1925. – 74 s.
4. Kravchienko, P. K. Economichieskije i kul’turnyje sviazi BSSR s zarubiezhnymi srtanami (1921–1932 gg.) : avtorief. dis. … kand. ist. nauk / P. K. Kravchienko. – Minsk, 1976. – 31 s.
5. Barynkin, A. V. Pol’sha vo vnieshniepolitichieskoj stratiegii Sovietskoj Rossii (1918–1919 gg.) : avtorief. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.15 / A. V. Barykin. – SPb., 2013. – 54 s.
6. Romanovskij, D. V. Vnieshnieekonomichieskije sviazi BSSR s zarubiezhnymi stranami (na primierie raboty Gostorgbiela v 1922–1931 gg.) : avtorief. dis. … kand. ist. nauk / D. V. Romanovskij. – Minsk, 2003. – 37 s.
7. Nacyjanal’ny arkhiu Respubliki Bielarus’ (NARB). – F. 491. Vop. 1. Spr. 100.
8. NARB. – F. 126. Vop. 1. Spr. 123.
9. NARB. – F. 126. Vop. 1. Spr. 81.
10. NARB. – F. 126. Vop. 1. Spr. 108.
11. NARB. – F. 126. Vop. 1. Spr. 106.
12. NARB. – F. 491. Vop. 1. Spr. 166.
13. NARB. – F. 491. Vop. 1. Spr. 111.
14. NARB. – F. 491. Vop. 1. Spr. 176.
15. NARB. – F. 126. Vop. 1. Spr. 174.


*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 21.02.2023*